# КАБ ЖЫЦЬ НЕ ТАК, «ЯК НАБЯЖЫЦЬ»

## Кантрольны спіс

Бліжэй да абеду мы трапляем у кабінет парламентарыя і яе памочніка. Самы час распытаць пра тое, з якімі просьбамі прыходзяць людзі да «свайго чалавека» ў вышэйшым заканадаўчым органе. Аказалася, што якраз 5 кастрычніка Наталля Гуйвік правяла асабісты прыём, на які прыйшлі 16 чалавек. Колькасць зваротаў падчас асабістых прыёмаў даходзіць да 25, а людзі звяртаюцца абсалютна з рознымі пытаннямі.

Усе звароты рэгіструюцца ў спецыяльных кнігах. Там апісваецца сутнасць праблемы ці прапановы, указваецца, на якой стадыі знаходзіцца вырашэнне пытання. Ёсць звароты, якія вырашыць можна літаральна за дзень — як, напрыклад, з магчымасцю плаціць за прыватызацыю праз АРІП, а ёсць і такія, што не вырашаюцца і за год. Такія звароты, адзначае парламентарый, яна бярэ на асабісты кантроль.

Па статыстыцы, 80% зваротаў тычацца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэта рамонты пад'ездаў, дахаў, добраўпарадкаванне двароў, пад'язных дарог...

— Быў калектыўны зварот жыхароў вуліцы Ніжнелугавой наконт пастаяннага зацякання вады на гэту вуліцу з вуліцы Асіпенкі. Над гэтай праблемай я б'юся з 28 красавіка 2014 года. Падкрэслю, па многіх пытаннях я і мой памочнік выязджаем па месцы і самі глядзім, чым там можна дапамагчы. Зрабілі запыты ў ЖКГ, Полацкі райвыканкам. Мне напісалі, што работы праведзены. Але, калі я паехала зноў на гэту вуліцу, то ўбачыла, што мяне падманулі. Вялікімі літарамі ў спісе са зваротамі я напісала: «Маняць!». На той вуліцы ўсё засталося па-старому... Гэтае пытанне зараз знаходзіцца на кантролі, і я давяду яго да канца.

Пытанняў, якія не вырашаны, але знаходзяцца на кантролі дэпутата і яе памочніка, у спісе даволі шмат — каля 20.

— Я ніводзін зварот без разгляду не пакідаю — праблема павінна быць вырашана: ці станоўча, ці адмоўна, — кажа мне Наталля Васільеўна. — Натуральна, добра, калі пытанне вырашаецца станоўча; калі ж мне даюць адмоўны адказ, я правяраю, наколькі ён абгрунтаваны, ці сапраўды яго немагчыма вырашыць станоўча.

## Людзі прапануюць удасканаліць законы

— Я працую са зваротамі, якія тычацца заканадаўчай ініцыятывы, – расказвае дэпутат. — Быў такі зварот ад адной палачанкі — аб унясенні змен і дапаўненняў у заканадаўства па адзіным падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і фізічных асоб за рэалізацыю кацянят і шчанят, — узгадвае Наталля Гуйвік. — На прыём прыйшла адзінокая жанчына-пенсіянерка і расказала, што ў яе ёсць маленькая гадаванка, якая ашчанілася. Утапіць шчанюкоў шкада, падарыць — таксама шкада. «Я ж пенсіянерка, хоць бы на корм жывёле зарабіць», — падумала жанчына і падала аб'яву ў газету. Аднак ёй зацікавілася падатковая інспекцыя і прапанавала пенсіянерцы заплаціць амаль паўмільённы падатак, а пасля ўжо прадаваць сваіх шчанят. «Якія паўмільёна падатку, калі ў мяне пенсія два мільёны?» — кажа жанчына.

— Яна прыходзіла да мяне на прыём і пыталася: ці можна падыходзіць да людзей індывідуальна ў падатковым пытанні? — расказвае дэпутат. — Калі гэта адзінокі чалавек, які не займаецца развядзеннем жывёлы, не зарабляе на гэтым грошай, дык ці можна ўвогуле вызваліць яго ад гэтага падатку? Натуральна, я накіравала гэты зварот у Міністэрства па падатках і зборах. Па пытанні ўнясення змен у падатковае заканадаўства было адмоўлена, але гэтай жанчыне было рэкамендавана ў наступны раз звярнуцца з заявай у раённы Савет дэпутатаў, які мае права вызваліць яе ад гэтага падатку. Жанчыну адказ задаволіў.

## Стукай — і адчыняць

Суразмоўца адзначае, што палачанам уласціва жыць не толькі сваімі асабістымі праблемамі, але і праблемамі горада.

— Быў зварот наконт аднаўлення таблічкі на помніку ў геаграфічным цэнтры Еўропы. У нас жа горад — цэнтр Еўропы, а тут знікла таблічка! Людзі адразу ж заўважылі, звярнуліся, цяпер таблічка аднаўлена.

І сама Наталля Гуйвік шмат сіл укладае ў тое, каб захаваць помнікі гісторыі свайго горада, яго культуры, каб Полацк стаў яшчэ больш камфортным для сваіх жыхароў і гасцей.

— Асноўная задача для мяне — выкананне Комплекснай праграмы развіцця Полацка, зацверджанай Указам Прэзідэнта. Напрыклад, будаўніцтва Палаца гульнявых відаў спорту. Адказныя за будаўніцтва — Міністэрства спорту і турызму, Віцебскі і Полацкі аблвыканкамы. Аднак куды мы ні звярталіся — натыкаемся на тое, што няма сродкаў. Пакуль. Мы гэта разумеем, але надзеі не губляем — Палац гульнявых відаў спорту ў нас павінен быць.

Набалелая праблема — Дом афіцэраў у Полацку, які, па словах дэпутата, разбураецца на вачах. Але ж гэта гісторыка-архітэктурны помнік!

— Гэты аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Я звярталася і ў Міністэрства культуры, і ў Міністэрства фінансаў, і ў Віцебскі аблвыканкам па грашовую дапамогу — мясцовы бюджэт не ў стане «пацягнуць» рэканструкцыю такога вялікага будынка. Хацелася б, каб на гэту праблему звярнулі ўвагу ўсе, хто адказвае за выкананне адпаведнага пункта комплекснай праграмы. Нельга, каб будынкі, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы, разбураліся.

Дэпутат прызналася, што, атрымаўшы адмоўны адказ, яна стараецца не засмучацца.

— Пад ляжачы камень вада не бяжыць, — лічыць яна. — Стукай, і табе адчыняць. Рана ці позна цябе пачуюць і дапамогуць.

Прыклад гэтаму — сітуацыя з капітальным рамонтам старога моста ў Полацку.

— Вельмі шмат было зваротаў наконт яго. Апоры моста маюць амаль стапрацэнтны знос. Давялося пабываць на асабістым прыёме ў губернатара Віцебскай вобласці. З абласнога бюджэту выдзелена 2 мільярды рублёў на завяршэнне праектна-каштарыснай дакументацыі. Гэты аб'ект будзе ўключаны ў абласную інвестыцыйную праграму на 2016 год.

* * *

У той дзень у Наталлі Васільеўны былі таксама запланаваны сустрэчы з працоўнымі калектывамі Полацкай універсальнай базы і жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Полацк»...

**Узгадвае дэпутат і такі выпадак з нядаўняй практыкі**

— Паступіў зварот ад юрыдычнай фірмы: неабходна абараніць канстытуцыйныя правы дзіцяці — грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, якое было, як гаварылася ў звароце, «выкрадзена на праспекце Францыска Скарыны ў Полацку, калі з ім гулялі бабуля і дзядуля». Прыехаў бацька-расіянін з некалькімі сябрамі, выхапіў дзіця з рук і павёз... Я зрабіла запыт у Полацкі РАУС і запрасіла інфармацыю, як расследуецца гэтае здарэнне — ці заведзена справа, ці праводзілася праверка, якія вынікі? Пакуль адказ не прыйшоў. Як толькі прыйдзе, буду думаць, што рабіць далей.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

**Фота аўтара.**
*yushkevich@zviazda.by*

**ПРАЦЭС ПАЙШОЎ**

# «АБ'ЕКТ» ПАВЫШАНАЙ УВАГІ

**На сваёй сесіі дэпутаты Баранавіцкага раённага Савета разгледзелі пытанне аб навядзенні парадку на могілках. Сесія была выязной. Яе ўдзельнікі наведалі аб'екты, абмеркавалі іх стан з вясковымі жыхарамі, старастамі вёсак. Пра тое, якая работа ў раёне вядзецца ў названым кірунку, гутарым са старшынёй раённага Савета дэпутатаў Сяргеем ДЗЯДОВІЧАМ.**



Старшыня Баранавіцкага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ДЗЯДОВІЧ.

— Першае, з чаго трэба было пачынаць работу, — расказвае Сяргей Іванавіч, — выпрацаваць праваўстаноўчыя дакументы, а дакладней, акты на зямлю, якія практычна па ўсіх названых аб'ектах адсутнічалі. Райвыканкам выдзеліў грошы на падрыхтоўку дакументацыі. І працэс, што называецца, пайшоў. Наяўнасць дакументаў, як вядома, становіцца першай умовай перадачы аб'ектаў на баланс іншых арганізацый. Так, са 134 могілак (столькі налічваецца ў раёне) трынаццаць перададзена на баланс жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Астатнія пакуль застаюцца на балансе сельсаветаў. Вось яны і з'яўляюцца нашым асаблівым клопатам.

Штогод кожны сельскі Савет складае план мерапрыемстваў навядзення парадку на зямлі. І заўсёды ў гадавым плане прысутнічае раздзел, які датычыць добраўпарадкавання могілак. **Сёння трэба прама гаварыць, што без дапамогі насельніцтва ажыццявіць запланаванае было б вельмі складана. Мясцовая ўлада не мае для гэтага дастаткова фінансаў.** Таму з жыхарамі вёсак, іх дзецьмі, што жывуць у горадзе, праводзіцца адпаведная тлумачальная работа. Як вынік, летась грамадзяне сабралі 238,5 мільёна рублёў. З пачатку года ў раёне ўжо сабрана 354,6 мільёна рублёў. Гэтыя сумы накіроўваюцца ў першую чаргу на пілаванне дрэў і навядзенне агульнага парадку на могілках.

***— Хто часцей становіцца ініцыятарам такой работы: сельская ўлада ці самі грамадзяне?***

— Бывае і так, і так. Ну вось, напрыклад, жыхарка Баранавіч Стэфанія Рыгораўна Быцко ўзначаліла работу па зборы сродкаў у вёсцы Цюхнявічы Навамышскага сельсавета. Вёска там зусім невялікая. Але яе жыхарам удалося сабраць 14 мільёнаў рублёў. За гэтыя грошы набылі сетку для агароджы. Сельскі Савет дапамог з купляй дроту, слупоў, абсталяваў кантэйнерную пляцоўку. Могілкі былі агароджаны, прыведзены ў парадак, а смецце цяпер своечасова скідваюць у кантэйнер, з якога адходы забірае транспарт ЖКГ.

У вёсцы Залессе Вольнаўскага сельсавета работу з насельніцтвам правялі дзве актывісткі Людміла Уладзіміраўна Бялкова і Марыя Уладзіміраўна Ліцкевіч. Яны сабралі 28 мільёнаў рублёў. Трэба сказаць, што могілкі ў Залессі знаходзяцца даволі далёка ад вёскі, там дарогі нармальнай не было. Да работы падключылася мясцовая гаспадарка — эксперыментальная база «Вольна», а затым і райвыканкам. Паставілі задачу дарожнай арганізацыі, паднапружыліся са сродкамі — і дарогу да могілак нарэшце прывялі ў парадак. Бо да гэтага ў вясновую альбо асеннюю непагадзь нават даехаць з пахавальным картэжам нярэдка станавілася праблемай.

Калі работа ў Залессі пачалася, людзі сабралі яшчэ грошай, усяго сума калектыўнага ўзносу грамадзян склала 55,5 мільёна рублёў. Былі знесены 93 аварыйныя дрэвы. Такім чынам, можна сказаць, што аддаленыя сельскія могілкі прыведзены ў поўны парадак. І гэта прыклад таго, як жыхары населеных пунктаў вырашаюць пытанне разам з уладай. У такіх выпадках, як правіла, не застаюцца ўбаку мясцовыя прадпрыемствы і арганізацыі.

> **Штогод вывозяцца тоны выкінутых на сметнік вянкоў і кветак. Гараць яны добра — але ж спальваць такія спецыфічныя адходы ні ў якім разе не дазволяць эколагі. Выходзіць, застаецца засмечваць зямлю?**

Прывяду яшчэ адзін прыклад, бо ён таксама падаецца характэрным. Могілкі вёскі Навасады, гэта Малахавецкі сельсавет, знаходзяцца ад яе больш чым за тры кіламетры — у лесе. Такое наогул рэдка бывае, каб людзі выбіралі месца спачыну настолькі далёка ад населенага пункта. Там дрэвы былі вельмі старыя і аварыйныя, іх знеслі за кошт сельсавета. Калі я гутарыў з людзьмі з Навасадаў, гаворка зайшла аб устаноўцы агароджы, і вяскоўцы сказалі, што яны для гэтага гатовыя выдаткаваць нават па мільёну рублёў сваіх сродкаў.

***— Названыя вёскі вы наведвалі і падчас выязной сесіі?***

— Сесія праходзіла ў Малахавецкім сельсавеце. Дэпутаты пазнаёміліся з добраўпарадкаваннем могілак у цэнтры сельсавета, а таксама ў Млынах і Багушах. Усе месцы спачыну прыведзены ў належны парадак. На сесіі нават нарадзілася ініцыятыва па добраўпарадкаванні магілы ўдзельніка вайны ў Афганістане, пахаванага ў Багушах. Дэпутаты сабралі свае грошы на гэтыя мэты. Па-рознаму паварочваецца жыццё. Здараецца, што няма каму даглядаць магілы. Названы выпадак можна аднесці да катэгорыі такіх. Але, на жаль, бывае інакш — калі недалёка жывуць дзеці, унукі, але пра магілы сваіх родных забываюць. Ніхто не наведваецца, нават каб бур'ян вырваць.

Для сесіі мы выбралі названы сельсавет, таму што там ёсць розныя прыклады падыходаў да добраўпарадкавання. Парадак наведзены на ўсіх могілках, але на адных устаноўлена жалезабетонная агароджа, на другіх — драўляная, на трэціх — сетка. Мы раіліся з дэпутатамі, як зрабіць добра і найбольш эканамічна.

***— Якія яшчэ праблемы ўздымалі на сесіі дэпутаты?***

— На сесіі мы не маглі абысці такое, напрыклад, пытанне, як рост колькасці бытавых адходаў вакол могілак. Усе мы ведаем, што вытворчасць вянкоў, штучных кветак — прыбытковы бізнес, бо названыя тавары цяпер запатрабаваныя. Але іх вытворцы ніяк не паклапаціліся пра далейшую ўтылізацыю або перапрацоўку прадукцыі (як, скажам, вытворцы ПЭТ-бутэлек). Штогод вывозяцца тоны выкінутых на сметнік вянкоў і кветак. Гараць яны добра — але ж спальваць такія спецыфічныя адходы ні ў якім разе не дазволяць эколагі. Выходзіць, застаецца засмечваць зямлю? Думаю, настаў час шукаць падыходы да вырашэння гэтай праблемы. Варта прыдумаць спосабы перапрацоўкі для названых адходаў альбо нейкім чынам мяняць грамадскую думку і адмаўляцца ад моды на штучныя кветкі і вянкі.



Могілкі ў вёсцы Жалезніца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
*Баранавіцкі раён.*

# ЯК НАПОЎНІЦЬ МАЛОЧНЫЯ РЭКІ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Напрыклад, браць пробы малака на тлустасць не раз на 10 дзён, а часцей. Гэта будзе дысцыплінаваць людзей, выхоўваць у іх адказнасць і перад суседзямі, і перад дзяржавай. Нікому не прыйдзе ў галаву разбаўляць малако вадой ці выліваць у агульную ёмістасць забруджанае. Малаказдатчыкам хацелася б, каб прыбор для замеру быў непасрэдна ў машыне, як раней, каб кожны ахвотны змог асабіста ўпэўніцца, што яго не падманваюць. А ў лабараторыі па-за кантролем здатчыкаў можна што заўгодна напісаць...

— Тут можна і за людзей заступацца, і за прадпрымальніка Алега Асаёнка, — казалі іншыя. — Дзякуй, што пагадзіўся збіраць малако. У іншых вёсках людзі не ведаюць, куды яго збываць. А тут ніякіх праблем: прыехала машына і цэнтралізавана даставіла сырадой па месцы прызначэння. А што датычыцца людзей, то, безумоўна, яны лічаць, што малако ад яго кароў самаесамае. Але ж да кожнага кантралёра не паставіш. Найлепшы кантралёр — асабістае сумленне.

Як распавядае **вядучы спецыяліст Даўгінаўскага сельскага Савета Наталля МІНЧЫК**, малако на тэрыторыі сельсавета збіраецца ў 21 населеным пункце. Яно закупляецца дзяржавай па ніжэйшых коштах у параўнанні з рознічнымі гандлёвымі цэнамі. Тым не менш людзям выгадна яго здаваць. Летась сельсавет заняў першае месца ў раёне па закупцы малака ў насельніцтва, атрымаў прэмію ў памеры 10 базавых велічынь. (За гэтыя сродкі набылі ксеракс, якім карыстаюцца як самі работнікі, так і ўсе ахвотныя жыхары.)

— У нас з індывідуальным прадпрымальнікам Алегам Асаёнкам склаліся добрыя адносіны. Але ж ёсць і праблемы. Напрыклад, прыходзяць людзі, скардзяцца на нізкую тлустасць. Разбіраемся. Да нядаўняга часу ў Алега Яўгенавіча быў абсталяваны пункт у суседнім Куранцы, дзе лабарантка рабіла аналізы. Калі ўзніклі спрэчныя пытанні, ён купіў новы сучасны апарат, які паказвае не толькі колькасць тлушчу, але і шчыльнасць, кіслотнасць, наяўнасць саматычных клетак. Узяў прадпрымальнік і новую лабарантку, якая будзе перыядычна выязджаць разам з вадзіцелем, што збірае малако, — распавяла Наталля Мінчык. — Думаю, калі ўзнікнуць нейкія праблемы, яна зможа некалькі разоў пераправерыць аналізы.

Наталля Віктараўна прывяла канкрэтную сітуацыю. Прыйшла ў сельскі Савет жанчына, паскардзілася, што заніжаюць тлустасць малака ад яе каровы. Узялі пробу паўторна — той жа самы вынік. Зноў не паверыла. І тады старшыня сельскага Савета павёз яе на малочнатаварную ферму, дзе ў яе прысутнасці правялі аналіз, які пацвердзіўся: тлустасць 2,0%.

Больш кабета не з'яўлялася: з фактамі не паспрачаешся...

*lazovskaya@zviazda.by*

# «ЗЯЛЁНЫ ДЗЕНЬ» І ВЫТВОРЧЫ ТУРЫЗМ

**У моладзі шмат цікавых, крэатыўных ідэй, якія датычацца мясцовага самакіравання, прычым некаторыя ініцыятывы ўлада ўжо сёння, так бы мовіць, прымае да ўвагі. Такое ўражанне засталося пасля адкрытых гарадскіх дэбатаў «Выбірай.by» у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.**

Дзве маладзёжныя каманды прапанавалі шэраг праектаў, скіраваных на тое, каб горад над Нёманам стаў яшчэ больш прыгожым, зручным для жыцця і прывабным для турыстаў. Прычым, недастаткова было проста агучыць свой праект — трэба было яго аргументаваць, адстаяць, адказваць на пытанні каманды-саперніцы, студэнтаў з залы, а таксама экспертаў, якімі выступілі прадстаўнікі гарвыканкама, універсітэта, дэпутацкага корпусу.

Зразумела, далёка не кожная прапанова мае рэальныя шанцы на ажыццяўленне. Напрыклад, як ставіцца да ідэі наземнага метро ў Гродне? Наколькі гэта мэтазгодна для горада, які не з'яўляецца мегаполісам? І якая, так бы мовіць, цана пытання? Тым не менш старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў Гой не назваў гэту хутчэй нават не ідэю, а мару ўтапічнай. Можа, у будучыні з'явіцца і такі від грамадскага транспарту?

А некаторыя прапановы могуць увасобіцца ў жыццё даволі хутка, прычым без бюджэтных затрат ці замежных інвестыцый. У прыватнасці, мэр падтрымаў ідэю заснавання ў Гродне свята па азеляненні горада пад назвай «Зялёны дзень». Альбо хіба ж не рэальна развіваць на базе шэрагу прадпрыемстваў вытворчы турызм, у тым ліку і з прафарыентацыйнымі мэтамі для школьнікаў?

Прагучалі падчас дэбатаў і прапановы, актуальныя не толькі для асобнага рэгіёна, але і для краіны ў цэлым. Напрыклад, прыняць алкагольную і тытунёвую прадукцыю з зоны крокавай даступнасці і прадаваць яе толькі ў спецыялізаваных крамах.

**У ТЭМУ**

*Убачыць, як рэалізуецца на практыцы аднойчы выказаная ідэя, можна, напрыклад, у агратурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы». Нядаўна тут адбыўся ўжо сёмы міжнародны пленэр рэзчыкаў па дрэве. Гаспадар комплексу — Гродзенскі мясакамбінат — забяспечвае іх драўнінай для творчасці, пражыванне і харчаванне, а ўсе скульптуры застаюцца ў маёнтку і радуюць яго наведвальнікаў. Сёлета дзякуючы майстрам з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны ў «Каробчыцах» пасяліліся героі пушкінскіх казак.*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

**СВАІМІ РУКАМІ**

# МАЙСТРЫХА АЛМАЗНАЙ ВЫШЫЎКІ

**Загадчыца ФАПа з вёскі Азіна Полацкага раёна ў вольны час займаецца... «алмазнай» вышыўкай, вязаннем і шыццём. Яе прысядзібны ўчастак — самы добраўпарадкаваны ў вёсцы. Ці не нагода завітаць у госці?**



Вось такі сімпатычны падворак.

На падворку **Алены ГЛІНСКАЙ** — драўляны млын, казачны дамок, альтанка... Такую прыгажосць цяжка не заўважыць, калі праязджаеш міма.

— Загадчыца нашага ФАПа Алена Анатолеўна — спецыяліст вышэйшай катэгорыі. Пра такіх кажуць: прафесіянал з вялікай літары. Вяскоўцы яе за гэта вельмі паважаюць. А яшчэ ў яе залатыя рукі, а двор самы прыгожы не толькі ў вёсцы, але і ў раёне. Алена Анатолеўна двойчы была пераможцай у раённым рэйтынгу: па лепшым домаўладанні і добраўпарадкаванні і па творчых работах. І сёлета, упэўнена, ёй ёсць чым здзівіць. Убачыце яе творы — самі ўсё зразумееце, — расказвае **старшыня Азінскага сельскага Савета Алена ЧУВАШЭНКА**.

— У гэтым рэйтынгу штогод вызначаюцца самыя адораныя людзі, найлепшыя населеныя пункты і гэтак далей. І часам адказныя асобы самі здзіўляюцца таленту і крэатыўнасці сваіх землякоў. Пераможцы атрымліваюць прызы, заахвочваюцца па месцы жыхарства, — дадае **Валянціна УЛАСЕНКА, прэс-сакратар Полацкага райвыканкама**.



Алена ГЛІНСКАЯ *(справа)* з дачкой.

Гаспадыня запрасіла нас у дом. Калі выказалі захапленне ўбачаным, патлумачыла, што шмат з гэтага зрабілі бацька і муж, які працуе мантажнікам на наваполацкім прадпрыемстве. Дарэчы, пакоі ў доме таксама вельмі стыльныя, утульныя.

— Ды нічога асаблівага, мы ж у вёсцы жывём, — пажартавала гаспадыня.

Усім бы так жыць. Творы Алены Анатолеўны можна выстаўляць у музеі.

— Мне проста падабаецца нешта рабіць сваімі рукамі. Лічу, што кожная жанчына, калі б захацела, змагла ствараць такое ж. Раней шыццём і вязаннем займалася. А летась купіла набор для вышыўкі стразамі... Калі правільна казаць, такая тэхніка мае назву «алмазная вышыўка». І наборы для выраბу прадаюцца. Вось на гэтую ікону спатрэбілася 12,7 тысячы стразаў. Не магу дакладна сказаць, колькі часу патрабуецца, каб зрабіць карціну, бо не кожны дзень удаецца вышываць, — распавядае Алена Глінская.

У ФАПе яна і фельчар, і акушэр, і аптэкар. Абслугоўвае жыхароў 12 вёсак. Бывае, дамоў прыходзіць бліжэй да ночы. Таму, зразумела, часу на творчасць мала, бо трэба ж паспець і хатнія справы парабіць. Яшчэ адно яе хобі — прыгатаванне нацыянальных беларускіх страў. Пачаставала беляшамі, дык ледзь язык не праглынуў.

На развітанне папрасіў паказаць увесь прысядзібны ўчастак. Гаспадары вырошчваюць на ім не толькі садавіну, агародніну, але і шмат кветак... Прыемна, што зямля беларуская, як калісьці, багатая не толькі на працавітых, але і на творчых людзей. Такіх не вабіць шум вялікіх гарадоў. Яны жывуць у глыбінцы ў гармоніі з сабой, прыродай і людзьмі. Вучаць аднавяскоўцаў таму, што пры жаданні можна зрабіць сваё жыллё прыгожым — такім, куды заўсёды хочацца вяртацца...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
**Фота аўтара.**
*Полацкі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.654. Нумар падпісаны ў 19.30 13 кастрычніка 2015 года.**